Чэпікаў У.

# ПОДЗВІГ ЗАВЯШЧАЕЦЦА ЮНЫМ

Жыў на маленькім хутары Патока ў Клічаўскім раёне хлапчук. Звычайны, вельмі сціплы вясковы хлапчук па імені Паўлуша Крыванос.

Ведаў ён сцяжынкі ў лесе за ваколіцай, ведаў, дзе больш за ўсё грыбоў і ягад можна назбіраць, дзе ў рацэ Вольсе лепш за ўсё рыбу вудзіць. Быў ён падобны на сваіх аднагодкаў, якім потым выпаў цяжкі лёс – у баях адстаяць Радзіму, яе шчасце, адстаяць жыццё.

Першы настаўнік Героя Савецкага Саюза Паўла Ананьевіча Крываноса – Дарафей Паўлавіч Солтан глядзіць на вучняў, сабраўшыхся на мітынг і працягвае свой расказ аб чалавеку, імем якога названа сярэдняя школа ў Клічаве і адна з цэнтральных вуліц гарадскога пасёлка.

– Ён нічым асаблівым не вызначаўся сярод сваіх сяброў. Можа толькі асаблівай разважлівасцю, самастойнасцю, успрыймальнасцю. Гаварыў ён як дарослы – спакойна, упэўнена. Вучыўся добра. У Сушанскую пачатковую школу хадзіў за чатыры кіламетры. Але ніколі не прапускаў урокаў, не спазняўся. Аднойчы ў веснавую распуціцу ён аказаўся адзіным вучнем, які перамог паводку і прыйшоў на заняткі.

Паўлу Ананьевічу Крываносу цяпер было б 45 год. Але мне ён запомніўся вечна юным хлапчуком, – заключыў свой расказ першы настаўнік Героя.

Яго дапоўніла Марыя Цярэнцьеўна Арэшка, былая аднакласніца Паўла. Разам з ім яна вучылася ў Клічаўскай сямігадовай школе. Кожны дзень ён рабіў па 8 кіламетраў туды і назад. Хадзіў у лыкавых лапцях, у даматканай вопратцы. Яго палатняная сумачка была бялейшай, сшыткі і падручнікі чысцей, чым у іншых. Ён вельмі любіў матэмэтыку і прыродазнаўства. На гэтых уроках пасля пытання настаўнікаў ён першым узнімаў руку.

Іншы раз да яго звярталіся некаторыя рабяты з просьбай: дай спісаць задачу... Павел прапаноўваў таварышу рашыць яе разам з ім.

Амаль трыццаць гадоў прайшло з таго часу, як скончыў Павел Крыванос Клічаўскую школу. Але ўвесь гэты час яна захоўвае памяць аб сваім выхаванцу. Яна памятала лепшага вучня тады, калі ён вучыўся ў Бабруйскім лясным тэхнікуме на аддзяленні механічнай апрацоўкі драўніны, калі ён працаваў, калі пайшоў служыць у армію.

Вайна заспела Паўла Крываноса на Далёкім Усходзе, дзе ён праходзіў службу ў інжынерна-чыгуначных войсках. Цяжка было чуць маладому салдату трывожныя паведэмленні з фронту: "Здадзен Мінск", "Пасля цяжкіх кравапралітных баёў Чырвоная Армія пакінула

Магілёў", "Фашысты на подступах да Смаленска"... Кожная з гэтых бязрадасных вестак аддавалася болем у сэрцы. "Як там, у роднай Беларусі? – пытаўся ў сябе ён. – Як цяпер жывуць бацька і маці? Яны ўжо старыя. Што робяць яго сёстры Лена і Оля?"

Пасля такіх роздумаў ён кожны раз пісаў камандзіру часці рапарты з просьбай накіраваць яго на фронт. Колькі ўжо ён падаў іх? Няўжо яшчэ раз адмовяць?

Але гэты рапарт аказаўся шчаслівым Просьбу Паўла Крываноса задаволілі. Ён трапіў у 253-і танкавы полк, якому пазней была прысвоена назва Гомельскага.

Тры гады ён ішоў насустрач перамозе. Дзесяткі разоў удзельнічаў у баявых аперацыях. Але па-ранейшаму, як і ў дзяцінстве. заставаўся сціплым і непрыкметным. Ён проста рабіў справу салдата. І толькі ў грудзях яго была тая іскрынка геройства і доблесці, якая аднойчы ўспыхнула яркім полымем і асвяціла славай яго імя.

Гэта здарылася 27 чэрвеня 1944 года. Выконваючы баявы загад па ліквідацыі акружанай часцямі Савецкай Арміі віцебскай групоўкі ворага, малодшы лейтэнант Павел Ананьевіч Крыванос праявіў выключную мужнасць і адвагу. З вялікай хуткасцю камандзір танкавага ўзвода ўвараўся на сваім "Т-34" у размяшчэнне ворага і ўступіў у адзінаборства з самаходнымі гарматамі "Фердынанд", якія не давалі прайсці ўперад нашай пяхоце.

У разгар жорсткага бою ён убачыў, што на танк камандзіра палка паўзе варожая гармата. Імгненне – і яна выплесне на яго струмень агню. Апярэдзіць яго, знішчыць! – гэта быў загад самому сабе. І танк Паўла Крываноса рвануўся наперарэз. Сваёй бранёй ён закрыў машыну камандзіра. Але сам быў смяртэльна ранены.

Ва ўзнагародным лісце аб яго баявым подзвігу расказваецца так: "Ахвяруючы сваім жыццём. П. А. Крыванос працягваў знішчаць гарматы супрацьтанкавай абароны немцаў, іх жывую сілу, кіраваць боем свайго ўзвода. Ён паклаў пачатак поўнага разгрому ворага ў раёне вёсак Буцяжы, Буронкі, Пясочна на подступах да Віцебска. Адданы сын нашай Радзімы камсамолец Павел Ананьевіч Крыванос праявіў смеласц, адвагу і загінуў смерцю героя. Камандзір узвода танкаў "Т-34" малодшы лейтэнант Крыванос П. А. дастойны прысваення яму вышэйшай урадавай узнагароды – звання Героя Савецкага Саюза пасмяротна". А ўнізе – подпісы камандзіра 253-га Гомельскага палка Солцера, камандуючага 5-й арміяй генерал-палкоўніка Крылова, камандуючага войскамі 3-га Беларускага фронту генерала арміі Чарняхоўскага, іншых вядомых военачальнікаў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 сакавіка 1945 года нашаму земляку было прысвоена пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза. А роўна праз дваццаць гадоў урадавая ўзнагарода ўручалася Клічаўскай сярэдняй школе, у якой ён вучыўся.

Гэты веснавы сонечны дзень стаў вялікім святам для рабятят, для ўсіх жыхароў пасёлка, што прыйшлі на ўрачысты мітынг да школы. Яна

ў гэты дзень стала непазнавальнай, расквяцілася кумачовымі сцягамі, транспарантамі.

– Мы перадаём вам на вечнае захаванне Грамату Героя Савецкага Саюза Паўла Ананьевіча Крываноса, – сказаў у сваім выступленні намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома М. Ф. Заваротны. – Няхай яна натхняе калектыў вучняў і настаўнікаў школы на выдатную вучобу і працу, няхай заўсёды напамінае аб гераічных справах савецкага народа, аб подзвігу земляка.

Прымаючы дарагую рэліквію, дырэктар школы І. Ф: Галацэвіч ад імя настаўнікаў абяцаў выхоўваць на баявых традыцыях падрастаючае пакаленне. У загадзе па школе ён аб'явіў аб занясенні навечна ў спісы навучэнцаў Паўла Ананьевіча Крываноса, аб стварэнні ў школе пакоя-музея Героя Савецкага Саюза.

Воіны Бабруйскага гарвізона, якія прыехалі на ўрачыстасць, падаравалі першы экспанат музею – макет танка Т-34, на якім ваяваў былы вучань.

Школьнікі Галя Булойчык і Валя Грашчанка пакляліся ад імя сваіх юных сяброў множыць у вучобе і працы славу Героя. У гэты ж дзень пад гукі Гімнаў Савецкага Саюза і Беларускай ССР на будынку школы была ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

А потым свята было перанесена ў раённы Дом культуры. Ва ўрачыстым канцэрце многа раз паўтараліся словы песні, якая нарадзілася ў Клічаве:

Помняць лясы
　　　　і дубровы
Подзвіг вялікі
　　　　твой...

І раптам усю залу запоўніла песня "Хай заўжды будзе сонца". Яе спявалі хлопчыкі падобныя на Паўла Крываноса ў дзяцінстве. Ён таксама спяваў піянерскія песні. Ён верыў, што над роднай зямлёй будзе ззяць сонца. Дзеля гэтага ён здзейсніў подзвіг. І завяшчаў яго сваім юным землякам.

**Чэпікаў, У. Подзвіг завяшчаецца юным / У. Чэпікаў // Магілёўская праўда. — 1965. — 30 сакавіка. — С. 3.**